УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3 (4Беи)я73
У68

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 11 ад 26.05.05 г.)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі *У. І. Навіцкі;*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У. В. Тугай*

*Складальнікі:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко*;
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М. М. Забаўскі*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *У. С. Пуцік*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. Ф. Рацько*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В. М. Фамін*

*Пад агульнай рэдакцыяй* А. П. Жытко

**Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму : вучэб. дапам. : у 5 ч. Ч. 1.
У68 Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / склад. А. П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд А. П. Жытко. – Мн. : БДПУ, 2005. – 138 с.
ISBN-985-501-098-1.

У дапаможніку асвятляюцца найбольш важныя праблемы сацыяльна-аграрнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да сялянства і памешчыкаў Беларусі на этапе капіталізму.

Адрасаваны студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ, можа быць выкарыстаны навукоўцамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3 (4Беи)я73**

**ISBN 985-501-098-1** (ч. 1)
**ISBN 985-501-083-3**

© Жытко, А. П. [і інш.], складанне, 2005
© БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

**Вучэбны дапаможнік**

**У пяці частках**

***Частка 1***

## *Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі*

уч 3115

Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 2005

даць імі. У Беларусі становішча ўскладнялася захаваннем і ў гады сталыпінскай рэформы сервітутаў. Гэта бачна на прыкладзе Мінскай губерні. Тут у 1913 г. з 2465 маёнткаў былі абцяжараны сервітутамі 969, а з ліку 4835 вёсак мелі права на сервітут 1544. Памкненні памешчыкаў і адміністрацыі да развярстання сервітутаў вывелі Мінскую губерню напярэдадні Першай сусветнай вайны на першае месца па колькасці і інтэнсіўнасці сялянскіх хваляванняў. Аднак у цэлым сялянскім рухам у гады паміж рэвалюцыяй і вайной у Беларусі было ахоплена толькі 940 паселішчаў, што складала 2 % ад іх агульнай колькасці. Гэта азначае, што сяляне не проста прымірыліся з цяжкім сваім становішчам, а хутчэй за ўсё большасць з іх пабачыла для сябе рэальную перспектыву па развіцці сваёй гаспадаркі ці ўладкаванні свайго жыцця іншым спосабам.

Супраціўляліся правядзенню сталыпінскіх пераўтварэнняў і ў памешчыцкіх, і ў бюракратычных колах. Яны не задавальнялі правакансерватыўныя і ахавальныя колы, паколькі закраналі і ўшчамлялі іх інтарэсы. Па меры рэалізацыі рэформа ўсё больш вызывала незадаволенасць аграрыяў. На з'ездах Аб'яднанага дваранства першапачатковыя прызывы да саюза з сялянствам, стварэння адзінага Усерасійскага саюза зямельных уласнікаў змяніліся поглядам на сялянства як на патэнцыяльнага ворага, а дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка стала разглядацца як свядомая акцыя па знішчэнню памешчыцкага землеўладання.

І ўсё ж пры ўсіх абмежаванасцях і недахопах сталыпінскіх законапраектаў найбольш прасунутай у практычным плане аказалася менавіта аграрная рэформа, якая і павінна была стаць стрыжнем усіх пераўтварэнняў у краіне, што меркаваліся ў той час. Яе асноўныя палажэнні былі цалкам рэальныя і прагрэсіўныя. Існуе вялікая верагоднасць таго, што рэалізацыя іх зняла б праблему рэвалюцыі, нават з улікам цяжкасцей, якія былі звязаны з сацыяльна-эканамічнай і палітычнай адсталасцю краіны. Аднак час быў упушчаны ў сувязі з тым, што эвалюцыйнае развіццё вёскі пасля 1861 г. было затарможана і дэфармавана недальнабачнай аграрнай палітыкай урада.

Спасылкі на негатоўнасць сялянства прыняць новаўвядзенне ў дадзеным выпадку наўрад ці можна прызнаць абгрунтаванымі. Гісторыя пацвярджае, што масы, як правіла, выслаўляюць і прасвятляюцца ў працэсе практыкі, у ходзе пераўтварэнняў. Сялянства, уласніцкія інстынкты якіх з цяжкасцю прабіваліся праз абшчыннасць, ва ўмовах Першай сусветнай вайны ўжо не спадзяваліся на інтэнсіфікацыю сваіх гаспадарак. Яно зноў зрабіла стаўку на вырашэнне сваіх праблем захопным шляхам. Незавершанасць рэформы, як і прадбачыў П. А. Сталыпін, не толькі не



хавала ўсе патугі ўрада на пераўтварэнні, але і дала шанс рэвалюцыянерам вырашыць зямельнае пытанне шляхам насілля.

З гэтага, аднак, не вынікае, што вопыт сталыпінскай аграрнай рэформы не мае практычнага значэння. Перш за ўсё ён сведчыць аб тым, што прагрэс селянскай гаспадаркі заўсёды залежыць ад існуючых пазямельных адносін. Толькі поўнае і незалежнае валоданне зямлёй спрыяе фарміраванню ў селяніна такіх якасцей, як гаспадарлівасць, руплівасць пра зямлю і гаспадарку, схільнасць да ўдасканалення сельскагаспадарчай вытворчасці на падставе ўкаранення дасягненняў навукі і практыкі. Не менш істотным з'яўляецца прызнанне неабходнасці ўвядзення розных форм землекарыстання і гаспадарання, што дазваляе выявіць найбольш жыццёваздольныя з іх. Вопыт рэформы паказаў, што вёсцы заўсёды патрэбна не голае адміністрыраванне і бюракратычнае самавольства, а рэальная дзяржаўная дапамога, без якой яна не можа эфектыўна дзейнічаць.

## *Тэсты*

I. Размясціце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці глаў урада:
1) С. Вітэ;
2) І. Гарамыкін;
3) А. Какоўцаў;
4) П. Сталыпін.

II. Публікацыя ўрадавага паведамлення па аграрнаму пытанню адносіцца да:
1) 20 чэрвеня 1906 г.;
2) 5 кастрычніка 1906 г.;
3) 9 лістапада 1906 г.;
4) 29 мая 1911 г.

III. Указ 9 лістапада 1906 г. набыў сілу закона:
1) 11 лістапада 1906 г.;
2) 14 кастрычніка 1908 г.;
3) 14 чэрвеня 1910 г.;
4) 29 мая 1911 г.

IV. Сталыпінская рэформа прадугледжвала:
1) захаванне абшчыннага землеўладання;
2) выдзяленне адрубных гаспадарак;
3) арганізацыю перасяленняў рускіх сялян у Беларусь;
4) арганізацыю фермерскіх гаспадарак;
5) арганізацыю хутарскіх гаспадарак.



РЭПАЗІТОРЫЙ БНТУ

V. Выхад з абшчыны ў Магілёўскай і Віцебскай губернях да 1916 г. склаў:
1) 22,0 %;
2) 28,9 %;
3) 48,0 %;
4) 56,8 %.

VI. Суаднясіце элементы двух мностваў:
1) 20 чэрвеня 1906 г.;
2) 5 кастрычніка 1906 г.;
3) 14 чэрвеня 1910 г.;
4) 29 мая 1911 г.

А) Ураўненне сялянства ў прававым статусе, астатнім насельніцтвам;
Б) Наданне ўказу 9 лістапада 1906г. статусу закона;
В) Публікацыя ўрадавага паведамлення па аграрнаму пытанню;
Г) Прыняцце закона аб землеўпарадкаванні.

VII. Да 1915 г. у Беларусі хутаране і адрубнікі пазбавіліся зямлі:
1) 28 %;
2) 32 %;
3) 36 %;
4) 48 %.

VIII. У 1905–1914 гг. Сялянскім банкам сялянам было прададзена дзесяцін зямлі:
1) 100 тыс.;
2) 250 тыс.;
3) 500 тыс.;
4) 1000 тыс.

IX. Пастанова Савета міністраў аб міграцыі сялян на казённыя землі адносіцца да:
1) 10 сакавіка 1906 г.;
2) 20 чэрвеня 1906 г.;
3) 5 кастрычніка 1906 г.;
4) 9 лістапада 1906 г.

X. Пазыкі перасяленцам на абзавядзенне гаспадаркай складалі:
1) 50 рублёў;
2) 100 рублёў;
3) 200 рублёў;
4) 450 рублёў



XI. Размясціце ў паслядоўнасці ад меншага да большага значэння губерні па колькасці перасяленцаў:
1) Віленская;
2) Віцебская;
3) Гродзенская;
4) Мінская;
5) Магілёўская.

XII. З 1907 па 1914 г. з Беларусі ў Сібір і на Далёкі Усход перасялілася звыш:
1) 100 тыс. чалавек
2) 300 тыс. чалавек
3) 500 тыс. чалавек
4) 1000 тыс. чалавек

XIII. Скарачэнне перасяленчага руху пачалося з:
1) 1906 г.;
2) 1909 г.;
3) 1910 г.;
4) 1911 г.

XIV. Прычынамі скарачэння перасяленчага руху ў Сібір былі:
1) спыненне дармавой раздачы зямлі ў Сібіры;
2) бясплатнае выдзяленне казённай зямлі ў беларускіх губернях;
3) адмена льгот перасяленцам;
4) арганізацыя ўрадам перасяленняў за межы Расіі.

XV. З усходніх раёнаў Расіі да 1914 г. вярнулася ў Беларусь перасяленцаў звыш:
1) 5 %;
2) 10 %;
3) 20 %;
4) 60 %.

XVI. Выдача сялянам безтэрміновых пашпартаў пачалася з:
1) 1906 г.;
2) 1909 г.;
3) 1910 г.;
4) 1911 г.

XVII. У выніку сталыпінскай аграрнай рэформы ў сялянскіх гаспадарках адбыліся:
1) падзенне ўраджайнасці;
2) павелічэнне колькасці рабочай жывёлы;
3) павелічэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы;
4) павелічэнне колькасці свіней.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ